МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

24 красавіка 2024 г. № 16 (749)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

# ДОБРАЯ ТРАДЫЦЫЯ, ПАДТРЫМАНАЯ ДОБРЫМІ СПРАВАМІ

**У рэспубліканскім суботніку 20 красавіка прынялі ўдзел каля трох мільёнаў беларусаў. Свой уклад у навядзенне парадку на зямлі ўнеслі і члены Савета Рэспублікі**

**Члены Прэзідыума Савета Рэспублікі на чале са Старшынёй Наталляй КАЧАНАВАЙ, работнікі Сакратарыята Савета Рэспублікі працавалі ў парку імя 40-годдзя Вялікага Кастрычніка ў Мінску.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.





Фота: тэлеграм-канал Савета Рэспублікі.

«Гэта на карысць нашага горада, нашай краіны, — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава. — Мы ганарымся чысцінёй, дагледжанасцю нашых вуліц, паркаў, сквераў. Нярэдка людзі не задумваюцца, якая гэта цяжкая праца. Праца тых людзей, якія займаюцца гэтым кожны дзень, — работнікаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, прадпрыемстваў, арганізацый. Каб Беларусь заўсёды заставалася такой цудоўнай і дагледжанай, мы павінны цаніць гэта. Той, хто сёння прыме ўдзел у суботніку і папрацуе, лішні раз ужо не кіне паперку і паспрабуе захаваць цудоўную прыроду, якая ёсць у нашай краіне, чысціню і добраўпарадкаванасць нашых вуліц».

Трэба шанаваць, берагчы і перадаваць традыцыю суботнікаў сваім дзецям, упэўнены старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Міхаіл Русы. «Бачыце, дзеці прыйшлі сёння на суботнік разам з татамі і мамамі. Яны ўжо далучыліся да гэтага. Гэта своеасаблівы такі патрыятычны парыў нашых людзей. Зрабі краіну лепшай, прыгажэйшай, багацейшай, любі яе — вось гэта самае галоўнае, — падкрэсліў ён. — І выдатна, што ёсць такая магчымасць паўдзельнічаць у суботніку».

Многія сенатары працавалі падчас суботніка ў рэгіёнах, са сваімі калектывамі.

Наталля Марковіч і Сяргей Мялешкін разам з кіраўніцтвам Ушацкага раёна Сяргеем Садоўскім, дэпутатамі райсавета, працоўнымі калектывамі, мясцовымі жыхарамі працавалі на добраўпарадкаванні абеліска ў вёсцы Слабада. Барыс Ціхаміраў разам з работнікамі структурных падраздзяленняў Аршанскага райвыканкама закладваў яблыневы сад на тэрыторыі Бабініцкай сярэдняй школы. Канстанцін Сіроцін прыняў удзел у рэспубліканскім суботніку на родным прадпрыемстве «Магілёўхімвалакно», добраўпарадкоўваючы тэрыторыю. Кіраўнік дэпутацкага корпуса Магілёўшчыны Аляксандр Гарошкін сумесна з кіраўніцтвам Магілёўскага аблвыканкама наводзіў парадак на тэрыторыі гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, дзе ідзе будаўніцтва новага корпуса.

Члены Савета Рэспублікі ад Гомельскай вобласці суботнік правялі ў вёсцы Красны Бераг Жлобінскага раёна, дзе на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Помнік дзецям — ахвярам Вялікай Айчыннай вайны» быў высаджаны яблыневы сад.

Аляксандр Карпіцкі разам з калектывам Брэсцкай абласной бальніцы наводзіў парадак у найбліжэйшай лесапаласе. Алег Румо разам з супрацоўнікамі Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, трансплантaлогіі і гематалогіі, які ён узначальвае, добраўпарадкоўвалі тэрыторыю цэнтра і прылеглай алеі. Гарык Барсамян працаваў разам з калектывам Мінскай раённай бальніцы, добраўпарадкоўваючы прылеглыя тэрыторыі.

Аляксандр Новікаў сумесна з віцэ-прэм'ерам Пятром Пархомчыкам і міністрам прамысловасці Аляксандрам Рагожнікам высаджваў алею ў гонар 30-годдзя Мінпрама і 60-годдзя ААТ «Інтэграл». Ілья Ікан разам з працоўным калектывам завода «Полацк-Шкловалакно» добраўпарадкоўваў Алею Герояў Савецкага Саюза ў парку імя 50-годдзя Савецкай улады ў Полацку...

І гэта далёка не ўсе прыклады ўдзелу сенатараў у суботніку, які ўжо ўспрымаецца як частка жыцця краіны. Суботнік — добрая традыцыя беларусаў, якая аб'ядноўвае многія пакаленні, адзначалі парламентарыі, падтрымліваючы гэтую традыцыю не словам, а справай.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Прыём грамадзян, устойлівае развіццё, Форум рэгіёнаў

### Падрабязнасці работы членаў верхняй палаты парламента

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Іванаўна КАЧАНАВА правядзе асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб:**

**30 красавіка 2024 г. у г. Мінску;**

**2 мая 2024 г. у г. Жлобіне ў рамках адзінага дня прыёму грамадзян членамі Савета Рэспублікі ў Гомельскай вобласці.**

***Як запісацца на прыём да Наталлі Качанавай, а таксама дзе і калі будуць працаваць у раёнах Гомельскай вобласці іншыя члены Савета Рэспублікі, можна даведацца ў тэлеграм-канале Савета Рэспублікі і на афіцыйным сайце sovrep.gov.by***

* * *

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Сівец прыняў удзел у семінары, прысвечаным Міжнароднаму дню інтэлектуальнай уласнасці. Размова ішла ў тым ліку і аб дасягненні Мэт устойлівага развіцця. У сваім выступленні ў рамках пленарнага пасяджэння семінара Сяргей Сівец асаблівы акцэнт зрабіў на тое, як уплываюць аднабаковыя прымусовыя меры на рэалізацыю МУР: «Санкцыйная палітыка наносіць страты працэсу шматбаковасці ў справе дасягнення МУР, у тым ліку палітычным механізмам і інстытутам для прадухілення і рэгулявання канфліктаў мірнымі сродкамі, падрывае правы найбольш уразлівых пластоў насельніцтва, у тым ліку ў сферы справядлівага ўдзелу ў палітычным і сацыяльна-эканамічным жыцці, парушае іх псіхасацыяльны дабрабыт».

* * *

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, генеральны дырэктар Цэнтра культуры «Віцебск» Глеб Лапіцкі прыняў удзел у абласным штабе па падрыхтоўцы аб'ектаў горада Віцебска да XI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

«Нам трэба прыняць гасцей высокага ўзроўню. Усе службы горада поўнасцю гатовы выканаць будаўнічыя работы якасна і ў тэрмін. Важна, што ўсё створанае будзе радаваць віцябчан не толькі ў дні правядзення Форуму рэгіёнаў, але і застанецца гараджанам своеасаблівым падарункам да юбілею: Віцебску сёлета спаўняецца 1050 гадоў», — адзначыў сенатар.

Удзельнікі штаба наведалі шэраг аб'ектаў гарадской інфраструктуры і сэрвісу. Сярод ключавых пляцовак — канцэртная зала «Віцебск». Штодня на аб'екце працуюць каля 270 чалавек. У высокай ступені гатоўнасці фасадныя, дахавыя работы і работы па добраўпарадкаванні тэрыторыі. Праводзяцца будаўнічамантажныя і пусканаладачныя работы. У шэрагу памяшканняў — фінішнае аздабленне, камплектаванне абсталяваннем і мэбляй.

На пасяджэнні штаба прынята рашэнне, што з 22 красавіка графік работ на аб'екце стане двухзменным, што дасць магчымасць паскорыць тэмпы будаўніцтва. Асаблівая ўвага ўдзяляецца забеспячэнню бяспекі знаходжання грамадзян у месцах правядзення масавых мерапрыемстваў.